# Што такое адзінства?

Панкевіч Дзмітрый, вучань VIII класа,
дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Рагозніцкая сярэдняя школа” Мастоўскі
раён

Што такое адзінства? Напэўна, кожны з нас неаднаразова задаваў сабе гэта пытанне. Задумаўся над ім і я.

Адзінства… З любоўю і пяшчотай, з пашанай і гонарам вымаўляю гэта слова. Спытаеце вы чаму? Таму што адзінства, у першую чаргу, пачынаецца з сям’і. Бацькі для мяне – гэта самыя родныя і дарагія людзі. У маёй сям’і пануюць любоў, мір, згода, узаемапаразуменне, павага адзін да аднаго. Мы любім бавіць час усе разам: чытаем кнігі, абмяркоўваем прагледжаныя кінафільмы, адпачываем на прыродзе. Кожнае лета падарожнічаем па нашай роднай Беларусі, вывучаем яе багатую гісторыю і культуру. Ужо наведалі палацавы комплекс у Ружанах, Косаўскі палац, гісторыка-культурны комплекс “Гродзенская крэпасць. Партызанскі лагер”, былі і ў Белавежскай пушчы. А колькі яшчэ цікавага і нязведанага наперадзе!.. Добрай традыцыяй стала збірацца ўсім разам на святы. Старэйшыя члены нашай сям’і расказваюць цікавыя гісторыі, успамінаюць, як жылося раней. Асабліва люблю слухаць пра дзяцінства маіх бацькоў. Кожны раз прашу бабулю ці дзядулю расказаць што-небудзь новенькае. Вось так у сям’і і нараджаецца адзінства – любоў да роднага куточка, павага да старэйшых, сувязь пакаленняў, згуртаванасць.

Адзінства… Гучыць па-сяброўску адкрыта, дружалюбна, даверліва. Зноў узнікае пытанне: чаму? Адзінства – гэта мой клас, мае сябры-аднагодкі. Нас у класе ўсяго шэсць чалавек. Усе мы розныя, але нас аб’ядноўваюць агульныя захапленні, імкненне да набыцця новых ведаў, пазнанне нечага цікавага і неверагоднага, гатоўнасць дапамагаць адзін аднаму і іншым. Наш дэвіз: “Мы – разам! Мы – адзінае цэлае!” І гэта не проста прыгожыя словы, за імі стаяць рэальныя справы: дапамога педагогам-ветэранам, удзел у валанцёрскай акцыі “А што Ты зрабіў для Беларусі?”, у працоўным дэсанце “Памяць. Адзінства. Якасць”. Аб’ядноўвае нас і тое, што я і мае аднакласніцы ўваходзім у склад сцяганоснай групы. Мы выказваем павагу да Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Стоячы на ўрачыстай лінейцы са сцягам у руках і выконваючы Дзяржаўны гімн нашай краіны, адчуваю гонар, непарыўную сувязь, еднасць з беларускім народам:

Мы, беларусы – мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Шчыра сябруем, сілы гартуем
Мы ў працавітай, вольнай сям’і.

Адзінства… Гучыць прыгожа, велічна і ўзнёсла. Перад вачыма паўстае родная Беларусь: шырокія палеткі, жытнёвы колас, спелае зерне, блакітныя васількі, белыя буслы, архітэктурныя помнікі, мемарыяльныя комплексы,

заводы-гіганты… Гэта мая вялікая Радзіма. Але ёсць яшчэ дарагая сэрцу мясціна. Гэта куточак дзяцінства, тое месца, дзе я нарадзіўся, мая малая радзіма – аграгарадок Вялікая Рагозніца, дзе цячэ рачулка Юхнаўка, тут родны дом, яблыневы сад, добразычлівыя суседзі і надзейныя сябры, школа, дзе вучыліся мае бацькі і дзе вучуся цяпер я.

17 верасня мы ўсёй краінай адзначаем адно з самых маладых святаў суверэннай Беларусі – Дзень народнага адзінства, якое ўстаноўлена загадам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі. Гэтае свята нагадвае нам аб падзеях 1939 года, калі беларусы ўсходніх і заходніх тэрыторый аб'ядналіся ў адзіную дзяржаву. Адноўленае адзінства ўзмацніла не толькі тэрыторыю краіны і павялічыла колькасць насельніцтва, а і дазволіла беларускаму народу выстаяць у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мы ведаем, што старонкі гісторыі Беларусі XX стагоддзя насычаны падзеямі, дзе толькі разам можна было вырашыць шматлікія задачы: аднаўленне сельскай гаспадаркі пасля вайны, будаўніцтва гарадоў, развіццё прамысловасці і эканомікі, пашырэнне навуковых адкрыццяў, узмацненне медыцыны, а таксама барацьба за ачышчэнне забруджаных тэрыторый пасля Чарнобыльскай катастрофы… Беларускі народ заўсёды імкнуўся старанна працаваць і мірна жыць, а калі спатрэбіцца, то ўзяцца за зброю і абараняць сваю краіну.

Я – юны патрыёт сваёй Радзімы. Пакуль што вучуся ў 8 класе, але ўжо зусім хутка мне прыйдзецца зрабіць крок у дарослае жыццё. Якую прафесію выбраць, кім працаваць, яшчэ дакладна не вырашыў, але ўпэўнены ў тым, што свой грамадзянскі абавязак буду заўсёды выконваць адказна. У нашага пакалення шчаслівае юнацтва, створаны ўсе ўмовы для навучання, адпачынку, нас выхоўваюць ва ўмовах даверу, адзінства і міру. Давайце не будзем забываць, што толькі разам мы сіла! Толькі разам мы пераадолеем усё!